

**Поршнева Ніна Міхайлаўна**
**(1928 г.)**

Нарадзілася ў г. Кайданава (БССР) у сям'і інтэлігентаў.

Пасля вайны Ніна Міхайлаўна жыла ва Уладзімірскай вобласці. Працавала ў дзіцячым садку, вучылася ў педвучылішчы. Нядоўгі час працавала інспектарам РАНА.

Па сямейных абставінах пераехала ў Беларусь, і – першым месцам працы на Гродзеншчыне быў Абухоўскі дзіцячы дом, затым, пасля яго расфарміравання – Луненскі (1957 – 1968 гг.). У 1968 годзе – перавод у Зэльву. Працуючы у Зэльвенскай санаторнай школе-інтэрнаце (1968 - 1995гг.), паступіла і скончыла Брэсцкі педінстытут.

Неднаразова ўзнагароджвалася за працу і грамадскую дзейнасць. Выдатнік народнай асветы.

Актыўна супрацоўнічала з раённай газетай "Праца". У 2007 годзе - ўдзельніца абласнога фестывалю "Паэзія - рух душы", узнагароджана граматай і падарункамі ад членаў гарадскога клуба паэтаў і бардаў "Надзея", а таксама альманахам паэзіі "Голас надзеі".

У 2010 годзе верш "Ветэранам Зэльвы - уключаны ў зборнік "Памяць вогненных гадоў", выпушчаны Гродзенскім Абласным Саветам ветэранаў да 65-годдзя Вялікай Перамогі. Адзіная ў гэтым зборніку іншагародняя сярод 22 аўтараў-гродзенцаў.

Памерла ў 2019 годзе.

**Бібліяграфія**

1. **Юрчик, И. Хватит жаловаться на "хваробы"**: за множеством интересных дел думать о них нашей читательнице Нине Поршневой в свои 85 лет просто некогда / Инна Юрчик // Рэспубліка. — 2013. — 15 кастрычніка. — С. 8.